Казка за казкай

ДАПАМОЖАШ ТЫ — І ТАБЕ ДАПАМОГУЦЬ

Афганскія казкі

Казка за казкай

ДАПАМОЖАШ ТЫ — І ТАБЕ ДАПАМОГУЦЬ

Афганскія казкі

Пераклад на беларускую мову **М. Пазнякова**

Мастак **В. Губараў**

Мінск
«Юнацтва»
1986

ДАПАМОЖАШ ТЫ— І ТАБЕ ДАПАМОГУЦЬ

Ішлі асёл і конь з базару. Так здарылася, што асёл быў наўючаны вышэй галавы, а конь бег улегцы.

Ішлі яны, ішлі, прайшлі паўдарогі. Стаміўся асёл, крэкча, ледзь дыхае.

— Будзь сябрам,— папрасіў ён каня,— дапамажы мне! Вазьмі частку грузу!

Але конь і вухам не павёў. Трохі счакаўшы, асёл пачаў маліць:

— У мяне ўжо сілы няма! Дапамажы!

Але конь толькі вушамі стрыжэ.

Дарога пайшла ўверх. Асёл адчувае, што вось-вось упадзе, і трэці раз просіць каня:

— Дапамажы!

— Добра,— згадзіўся конь,— сёе-тое я вазьму на сябе: ты нясі груз, а я буду за цябе крактаць і аддыхвацца.

Асёл прайшоў яшчэ з дзесятак крокаў і ўпаў.

— Уставай, уставай, мілы! — просіць гаспадар, але асёл не змог падняцца.

Рабіць няма чаго, разгрузіў гаспадар асла і ўсю паклажу ўзваліў на каня.

Цяпер асёл бег улегцы, а конь крактаў і аддыхваўся за двух...

© Пераклад на беларускую мову. Ілюстрацыі. Выдавецтва «Юнацтва», 1986.

ВОЎК-ДАНОСЧЫК

Было ці не было, аднойчы тыгр, падышах звяроў, захварэў. Насмарк падхапіў! Вядома, ад гэтай хваробы не паміраюць. Але сапсаваўся настрой уладара — а гэта смяртэльна небяспечна для падданых. Таму ўсе звяры, як адзін, прыйшлі да тыгра, каб засведчыць яму сваю адданасць. І толькі лісы не было. Тыгр, які ў той дзень не хацеў



нічога ведаць, апрача свайго носа, мабыць, не заўважыў бы яе адсутнасці, калі б не воўк.

— Мой уладар,— зашаптаў воўк тыгру на вуха,— усе звяры сабраліся, каб сказаць «будзь здаровы», ледзь толькі ты чхнеш, а лісы чамусьці няма...

Тыгр разгневаўся і загадаў знайсці лісу і прывесці да яго.

Ліса пра гэта, безумоўна, даведалася і хуценька сама прыбегла да тыгра.

— Рыжае стварэнне! — зароў уладар.— Усе звяры прыйшлі пажадаць мне здароўя, а ты?!

— Не сярдуй, о васпан,— адказала ліса.— Як толькі я даведалася пра тваю хваробу, адразу пабегла шукаць лекі.

— Ах, так...— памякчэў тыгр.— І знайшла што-небудзь?

— Ага! Самы надзейны сродак ад насмарку схаваны ў задняй левай пятцы нашага ваўка.

— Няўжо? — здзівіўся тыгр.— Толькі глядзі: калі сродак не падзейнічае, бойся!..

Але ліса ніколькі не баялася. Бо насмарк — гэта такая хвароба: лячы яе чым хочаш, толькі хутчэй, а то і сама пройдзе.

Праз некалькі дзён ідзе ліса па лесе, а насустрач ёй воўк. На трох нагах! Тут ліса яму і кажа:

— Запомні, дружа мой: даносчык падобны на таго, хто плюе ўверх, а потым здзіўляецца — што гэта за раса ўпала яму на галаву?

ПАДЫШАХ І САДОЎНІК

Расказваюць, як аднойчы праязджаў падышах міма саду і ўбачыў за плотам старога, які садзіў персікавае дрэўца.

— Гэй, стары,— звярнуўся падышах да садоўніка,— тваё жыццё на зыходзе, ты ўжо не дачакаешся пладоў з гэтага дрэва, дык навошта твае клопаты?.. Ну, ведаю, ведаю, ты скажаш: «Продкі нашы працавалі на нас, а мы павінны думаць пра нашчадкаў». Але скажы, ці ёсць сэнс думаць пра мінулае, якое адышло ў цемру, і пра будучае, якое яшчэ не выйшла з цемры? Бо толькі сучаснае належыць нам.

— Ці табе, уладару, зразумець садоўніка! — адказаў стары.— Ты не хочаш успамінаць мінулае — значыць, яно ў цябе такое, што лепш бы яго зусім не было, ты не хочаш думаць пра будучае — значыць, ты яго баішся. Так што не зайздрошчу я твайму сучаснаму!

СПРАВЯДЛІВЫ СУДДЗЯ

У аднаго скупога чалавека прапаў кашалёк, у якім было сто ашрафі[1]. Як ён ні шукаў, як ні стараўся — нічога не знайшоў. Тады ён аб'явіў: «Таму, хто знойдзе мой кашалёк і верне грошы, я дам дзесяць ашрафі».

Знайшоў гэты кашалёк адзін добры чалавек і аддаў скупому.

— Давай мне дзесяць ашрафі, якія ты абяцаў,— гаворыць добры чалавек.

— У гэтым кашальку было сто дзесяць ашрафі,— адказаў скупы,— а зараз тут толькі сто. Дзесяць ашрафі засталіся ў цябе. Ты ўжо атрымаў сваю долю! Чаго ж ты яшчэ ад мяне хочаш?

Пайшоў той чалавек да суддзі і расказаў яму ўсё. Паклікаў суддзя скупога і пытае:

— Чаму не аддаеш яго долю?

— Ды ён сам узяў яе з гэтага кашалька,— адказвае той.— Што я яму дам?

Суддзя ўзяў кашалёк, агледзеў яго і завязаў так, як той быў завязаны раней. Потым і кажа скупому:

— Калі ў тваім кашальку было сто дзесяць ашрафі, а тут толькі сто, то ясна, што кашалёк не твой. Ідзі пашукай свой кашалёк, а гэты аддай чалавеку, які яго знайшоў. Калі прыйдзе гаспадар кашалька, ён яму і верне.

---

[1] А ш р а ф і — залатая манета.

Змест

ДАПАМОЖАШ ТЫ —
І ТАБЕ ДАПАМОГУЦЬ
5

ВОЎК-ДАНОСЧЫК
6

ПАДЫШАХ І САДОЎНІК
9

СПРАВЯДЛІВЫ СУДДЗЯ
12

10 к

Сказка за сказкой

ПОМОЖЕШЬ ТЫ — И ТЕБЕ ПОМОГУТ

Афганские сказки

Для детей дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Загадчык рэдакцыі М. А. Казбярук. Рэдактар Н. І. Мірончык. Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова. Мастацкі рэдактар А. У. Ружо. Тэхнічны рэдактар А. В. Русецкая. Карэктар Л. С. Мануленка.

ІБ № 754

Здадзена ў набор 02.10.85. Падп. да друку 13.03.86. Фармат 84×90¹/₁₆. Папера афс. № 2. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 1,40. Ум. фарб.-адб. 5,6. Ул.-выд. арк. 1,72. Тыраж 80 000 экз. Зак. 162. Цана 10 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Набрана на Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Надрукавана на Мінскай фабрыцы каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

4803020000— 059
Д ——————— 37—86
М 307(05)—86

ББК84.5Аф
Д19